

ХТО ШЧАСЛІВЫ ШТОДЗЕНЬ ЗАЙМАЦЦА ФАТАГРАФІЯЙ? ЧЫРВОНКА

ІХ НАЗВАЛІ АТЛАНТАМІ ЧЫРВОНКА





Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

9 ЛІПЕНЯ 2020 г. ЧАЦВЕР № 131 (29245)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Сяргей КАВАЛЬЧУК, міністр спорту і турызму (на адкрыцці фізкультурна-аздараўленчага комплексу ў Навагрудку):**

*«Штогод мы адкрываем некалькі такіх спартыўных збудаванняў. Напрыклад, у Гродзенскай вобласці ў пачатку гэтага года аналагічны комплекс пачаў працаваць у Астраўцы. Пастаўлена задача, каб у кожным раённым цэнтры былі падобныя аб'екты. У кожнай з абласцей у наступныя пяць гадоў запланавана будаўніцтва як мінімум 2-3 такіх ці падобных спартыўных комплексаў».*

# Першы хрусткі ўраджай



На прадпрыемстве «Фірма «Кадзіна» Магілёўскага раёна пачалі ўбіраць раннюю капусту. За тыдзень гаспадарка прадала праз фірмовыя крамы сем тон сакавітай зялёнай прадукцыі. Капусту тут вырошчваюць на 30 гектарах, і, гледзячы на першы ранні ўраджай, аграном-агароднінавод Вікторыя КРУТАВА спадзяецца, што і больш позняя сарты не падвядуць.

Фота БелТА.

## КОРАТКА

• **Беларусь накіравала гуманітарную дапамогу ва Украіну для ліквідацыі наступстваў паводкі на захадзе краіны.**



• Урад вызначыў парадак кампенсацыі грамадзянам расходаў на электразабеспячэнне.

• **Па новай праграме «Сямейны капітал» ужо 3662 шматдзетныя сем'і адкрылі дэпазітныя рахункі.**

• Больш за 80 чалавек дзесяці нацыянальнасцяў прыляцелі з Дэлі ў Мінск чартарам «Белавія».

• **Вучоныя БДУ распрацавалі інавацыйную ахоўную маску.**



• Спектакль Купалаўскага тэатра «Шляхціц Завальня» пакажуць у новым аўтакінатэатры ў Мінску.


ISSN 1990 - 763X


Спадчына

## «Перамаглі, адбудавалі нашу краіну і крочым далей у будучыню...»

### Што сімвалізуе ўнікальны габелен з выявай Маці-Беларусі, і хто ўвасоблены ў вобразе франтавой медсястры

**У Гродне падчас святкавання Дня Незалежнасці прадстаўлены габелен, які выткалі спецыяльна да 75-годдзя Вялікай Перамогі. Работа вялася на працягу пяці месяцаў, і ў выніку атрымалася даволі вялікае палатно памерам 1,5 на 2 метры. Ажыццявіла гэты праект творчая група ў складзе мастака Яўгена ШУНЕЙКІ і ткачых Алены ШУНЕЙКІ і Юліі БАРАДЗІНОЙ.**

Першае, што кідаецца ў вочы, — гэта яркія фарбы. Яны асабліва зіхацяць па контуры палатна. Гэта элементы беларускага арнамента, птушкі, васількі, папараць. Вядома, прыцягвае ўвагу цэнтральны вобраз — Маці-Беларусі. Яна трымае на руках маленькага хлопчыка, які гатовы выпусціць у палёт птушку. Паступовa позірк пераходзіць на іншыя фрагменты, якіх нямала. Кампазіцыйна габелен падзелены на тры часткі. Першая складзена з двух фрагментаў, на адным з якіх — воіны-вызваліцелі, на другім — партызаны. Гэта тыя, хто здабываў перамогу ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Другая частка сімвалізуе сучаснае жыццё, тут прысутнічаюць прадстаўнікі самых розных прафесій. На трэцяй можна знайсці адметныя аб'екты ўсіх абласных цэнтраў і горада Мінска.

— Яркія фарбы — гэта задумка, — расказвае ткачыха Алена Шунейка. — Праўда, на кардоне яны былі не такія яркія, але мы так падабралі ніткі, каб было прыгожа. Каб адчувалася радасць, што мы вытрымалі, перамаглі, адбудавалі нашу краіну і пойдзем далей у будучыню.


СТАР. 4


Запрашальнік

## СЯБРЫ ЗБІРАЮЦЦА НА БЕРАЗЕ ДНЯПРА

**Майстры і творчыя суполкі народных рамёстваў з чатырох краін возьмуць удзел у рэспубліканскім фестывалі «Купалле» («Александрыя збірае сяброў»), які пройдзе ў аграгарадку Александрыя Шклоўскага раёна 11—12 ліпеня. Дарэчы, упершыню свята адбудзецца пад патранатам ЮНЕСКА.**



Фота БелТА.

Як адзначаюць у Магілёўскім абласным метадычным цэнтры народнай творчасці, на традыцыйным «Александрыйскім кірмашы» чакаюць сёлета народных майстроў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, захавальнікаў традыцыйных рамёстваў не толькі з усіх рэгіёнаў Беларусі, але таксама з Расіі, Украіны і Літвы.


СТАР. 13